БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

# БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ОМ 18 РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ

НИГА II

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:**

**Г.П.ПАШКОЎ** (галоўны рэдактар), **В.С.АНОШКА, Я.М.БАБОСАЎ, В.К.БАНДАРЧЫК, М.А.БАРЫСЕВІЧ, В.І.БОЎШ, Т.Я.БУРАКОВА** (намеснік галоўнага рэдактара), **А.П.ВАЙТОВІЧ, І.Дз.ВАЛАТОЎСКІ, М.С.ВЫСОЦКІ, І.В.ГАЙШУН, А.М.ГАНЧАРЭНКА, Р.Г.ГАРЭЦКІ, В.М.ГУРЫН, А.М.ДАНІЛАЎ, В.В.ЗУЁНАК, М.П.КАСЦЮК, І.В.КАТЛЯРОЎ, С.Н.КНЯЗЕЎ, П.Д.КУХАРЧЫК, У.Р.ЛАТЫПАЎ, С.С.ЛАЎШУК, І.М.ЛУЧАНОК, Г.М.ЛЫЧ, Л.С.МАЛЬЦАЎ, А.В.МАЦВЕЕЎ, І.Я.НАВУМЕНКА, А.І.ПАДЛУЖНЫ, П.Ц.ПЕТРЫКАЎ, М.Ф.ПІЛІПЕНКА, У.В.РУСАКЕВІЧ, А.В.САБАЛЕЎСКІ, М.А.САВІЦКІ, А.Г.СЛУКА, М.С.СТАШКЕВІЧ, М.В.СТОРАЖАЎ, Л.М.СУШЧЭНЯ, А.К.ФЯДОСАЎ** (намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар), **І.П.ХАЎРАТОВІЧ, В.П.ШАРАНГОВІЧ.**

Репозиторий БГПУ

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
2004

**Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Беларусі ў 1950-х — сярэдзіне 1980-х г.** . . . . . . . . . . . . . . 269

**На шляху да суверэнітэту і дэмакратызацыі** . . . . . 275

**Рэспубліка Беларусь на мяжы 20—21 стагоддзяў** . . 282

**Ідэалогія беларускй дзяржавы. Беларуская мадэль развіцця** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 287

**Беларуская дыяспара** . . . . . . . . . . . . 288

**ЭКАНОМІКА** . . . . . . . . . . . . . . . . . 293

**Асноўныя этапы развіцця** . . . . . . . . . . . 293

**Структура і кіраванне** . . . . . . . . . . . . . 297

**Фінансы і крэдыт** . . . . . . . . . . . . . . . 300

**Прамысловасць** . . . . . . . . . . . . . . . . . 304
Энергетыка (307). Паліўная прамысловасць (312). Машынабудаванне і металаапрацоўка (315). Хімічная і нафтахімічная прамысловасць (322). Прамысловасць будаўнічых матэрыялаў і канструкцый (324). Лясная, дрэваапрацоўчая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць (328). Паліграфічная прамысловасць (331). Лёгкая прамысловасць (331). Харчовая прамысловасць (333).

**Сельскагаспадарчая вытворчасць** . . . . . . . . . . 338
Раслінаводства (341). Жывёлагадоўля (345). Меліярацыя (349). Лясная гаспадарка (350).

**Будаўніцтва** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 353

**Транспарт** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 357

**Сувязь і інфарматызацыя** . . . . . . . . . . . . 363

**Гандаль** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 366

**Дабрабыт народа** . . . . . . . . . . . . . . . . 369

**Сацыяльная абарона насельніцтва** . . . . . . . . 374

**УЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ** . . . . . . . . . . . . . . . 377
Узброеныя сілы і вайсковыя фарміраванні на Беларусі ў 9 — пач. 20 ст. (377). Узброеныя сілы і вайсковыя фарміраванні ў 1920—80-я г. (379). Узброеныя сілы Рэспублікі Беларусь (382). Сухапутныя войскі (385). Ваенна-паветраныя сілы і войскі проціпаветранай абароны (386). Спецыяльныя войскі (387). Пагранічныя войскі (388). Унутраныя войскі (390). Органы і падраздзяленні міністэрства па надзвычайных сітуацыях (391). Навучальныя ўстановы (391).

**АХОВА ЗДАРОЎЯ** . . . . . . . . . . . . . . . . 393
Гісторыя аховы здароўя на Беларусі (393). Сістэма аховы здароўя Рэспублікі Беларусь (397).

**ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І СПОРТ** . . . . . . . . . . 403
Гісторыя (403). Фізічная культура і спорт у 1919—41 (403). Фізічная культура і спорт у 1944—90 (404). Фізічная культура і спорт Рэспублікі Беларусь (405). Арганізацыйна-структурная будова спорту і турызму (406). Спартыўная матэрыяльна-тэхнічная база Рэспублікі Беларусь (406). Падрыхтоўка і выхаванне кадраў па фізічнай культуры і спорце (409). Спартсмены Беларусі на алімпійскіх гульнях (409).

**АСВЕТА** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 412
Дашкольная адукацыя і выхаванне (412). Агульнаадукацыйная школа (413). Прафесійна-тэхнічная адукацыя (415). Сярэдняя спецыяльная адукацыя (416). Вышэйшая адукацыя (416).

**КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫЯ ЎСТАНОВЫ** . . . . . . 418
Клубныя ўстановы (418). Бібліятэкі (421). Музеі (422). Паркі (424). Ахова гісторыка-культурнай спадчыны (426).

**ДРУК, ТЭЛЕБАЧАННЕ І РАДЫЁВЯШЧАННЕ** . . 428

**Друк** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 428
Выдавецкая справа (428). Перыядычны друк (436).

**Тэлебачанне** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 441

**Радыёвяшчанне** . . . . . . . . . . . . . . . . . 445

**НАВУКА** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 450

**Навука і навуковыя ўстановы** . . . . . . . . . . 450

**Сацыяльна-гуманітарныя навукі** . . . . . . . . . 458
Гісторыя філасофскай і грамадскай думкі (458). Філасофія (459). Сацыялогія (461). Паліталогія (462). Этыка (463). Эстэтыка (464). Рэлігіязнаўства (464). Культуралогія (465).

**Педагагічныя і псіхалагічныя навукі** . . . . . . . . 466
Педагогіка (466). Псіхалогія (467).

**Гістарычныя навукі** . . . . . . . . . . . . . . . 468
Гісторыя Беларусі (468). Даследаванні па ўсеагульнай гісторыі (470). Археалогія (471). Этналогія (472). Антрапалогія (473). Гістарыяграфія (473). Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны (474).

**Эканамічныя навукі** . . . . . . . . . . . . . . . 475
З гісторыі эканамічнай думкі Беларусі (475). Агульныя праблемы эканамічнай тэорыі (477). Эканоміка прамысловасці (478). Эканоміка аграпрамысловага комплексу (478). Эканоміка будаўніцтва (479). Эканоміка гандлю (480). Эканоміка транспарту (480). Улік і эканамічны аналіз (481). Статыстыка (481). Дэмаграфія (482). Эканамічная гісторыя Беларусі (483). Міжнародныя аспекты эканамічнай тэорыі (483).

**Юрыдычныя навукі** . . . . . . . . . . . . . . . 484
Гісторыя дзяржавы і права (484). Канстытуцыйнае права (485). Грамадзянскае права (486). Грамадзянскае працэсуальнае права (486). Аграрнае, зямельнае і экалагічнае права (487). Крымінальнае права (488). Судаўладкаванне і крымінальны працэс (482). Працоўнае права (489). Міжнароднае права (489).

**Філалагічныя навукі** . . . . . . . . . . . . . . 490
Літаратуразнаўства (490). Мовазнаўства (495). Фалькларыстыка (498).

**Мастацтвазнаўчыя навукі** . . . . . . . . . . . . 501
Мастацтвазнаўства (501). Музыказнаўства (502). Тэатразнаўства (505). Кіназнаўства (507).

**Матэматычныя навукі** . . . . . . . . . . . . . . 508
Тэорыя лікаў (508). Алгебра (509). Алгебраічная геаметрыя (509). Геаметрыя (510). Тэорыя апраксімацыі (510). Тэорыя функцый і інтэгральных ураўненняў (511). Тэорыя звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў (511). Матэматычная фізіка (512). Тэорыя аптымальнага кіравання (512). Функцыянальны аналіз (513). Вылічальная матэматыка (513). Тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка (514). Тэорыя графаў (514). Даследаванне аперацый (515).

**Фізічныя навукі** . . . . . . . . . . . . . . . . 515
Спектраскапія і люмінісцэнцыя (516). Фізічная оптыка (517). Лазерная фізіка (518). Нелінейная оптыка (519). Радыёфізіка і электроніка (519). Фізіка цвёрдага цела (520). Фізіка паўправаднікоў (520). Магнітныя матэрыялы (521). Фізіка плазмы (521). Ядзерная фізіка (522). Фізіка палёў і элементарных часціц (522).

**Хімічныя навукі** . . . . . . . . . . . . . . . . 523
Неарганічная хімія (523). Арганічная хімія (525). Фізічная хімія (526). Аналітычная хімія (527). Біяарганічная хімія (527). Хімія высокамалекулярных злучэнняў (528). Калоід-

Рэпазіторый БДПУ



Стадыён Віцебскага цэнтральнага спартыўнага комплексу.

Дом фізкультуры ў Маладзечне, фізкультурна-аздараўленчыя комплексы (ФАК) «Атлет» і «Лагойскі» ў Лагойску, спорткомплекс «Юнацтва» ў Плешчаніцах, спорткамбінат у Барысаве, ФАКі, стадыёны ў раённых цэнтрах, пры буйных прадпрыемствах і інш.

*У.В.Міневіч, А.М.Петрыкаў.*

**ПАДРЫХТОЎКА І ВЫХАВАННЕ КАДРАЎ ПА ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ І СПОРЦЕ**. Пачаткам развіцця на Беларусі фізічнага выхавання і падрыхтоўкі спарт. кадраў можна лічыць «Інструкцыю і праграму выкладання гімнастыкі ў мужчынскіх установах» (1889) Мін-ва нар. асветы, дзе былі сфармуляваны агульныя палажэнні пра задачы фізічнага выхавання, методыка правядзення заняткаў і пералік фізічных практыкаванняў, што ўводзіліся ў школе як абавязковы прадмет. У шэрагу навуч. устаноў, у т.л. ў некаторых прыходскіх вучылішчах, падобныя заняткі вяліся яшчэ да з'яўлення адпаведных інструкцый, з выкарыстаннем нар. гульняў і фізічных практыкаванняў. У 1910—14 заняткі гімнастыкай і фізічнымі практыкаваннямі ў многіх навуч. установах сталі рэгулярнымі, што патрабавала адпаведных кваліфікаваных выкладчыцкіх спарт. кадраў. Спачатку гэта былі запрошаныя з Расіі ці з-за мяжы (з Чэхіі і інш.) спарт. спецыялісты, якія працавалі пераважна ў створаных на той час спарт. арганізацыях і філіялах рас. спартыўных т-ваў — Мінскае т-ва аматараў спорту, «Сокал» і інш. Да 1917 у гарадах Беларусі функцыянавала каля 70 спарт. гурткоў, клубаў і т-ваў, у якіх займаліся больш за 2,5 тыс. чал.: 2 з такіх клубаў працавалі (паводле сучаснага падзелу) у Брэсцкай вобл., 10 — у Віцебскай, 13 — у Гомельскай, па 6 — у Гродзенскай і Магілёўскай, 11 — у Мінскай.

У БССР сістэматычная падрыхтоўка спецыялістаў па фізічнай культуры і спорце пачалася ў 1920-я г. Спачатку гэтым займаліся аддзелы Усевобуча, якія рыхтавалі інструктараў па фізічнай культуры і дапрызыўнай падрыхтоўцы. Пазней выкладчыкаў, трэнераў і суддзяў па спорце рыхтавалі курсы і семінары пры Вышэйшым савеце фізічнай культуры БССР, Наркамаце асветы БССР, Цэнтральным і абласных камітэтах ЛКСМБ.

У 1929 у Мінску адкрыты Бел. тэхнікум фізічнай культуры — першая сярэдняя спец. навуч. ўстанова, якая рыхтавала кадры выкладчыкаў фізічнага выхавання. У 1937 тэхнікум пераўтвораны ў Бел. ін-т фізічнай культуры (ІФК). Да сярэдзіны 1941 падрыхтаваны 853 спецыялісты па фізічнай культуры і спорце, у т.л. 102 мелі вышэйшую адукацыю. Акрамя таго, у рэспубліцы працавалі спецыялісты, падрыхтаваныя ў Цэнтр. ін-це фізічнай культуры ў Маскве і Ленінградскім ін-це фізічнай культуры імя П.Ф.Лесгафта. Усяго працавала каля 1 тыс. спецыялістаў па фізічнай культуры і спорце.

Пасля Вял. Айч. вайны падрыхтоўка кадраў па фізкультуры і спорце ажыццяўлялася ў Мінскім ІФК, Мінскім (пазней Віцебскім) і Гродзенскім тэхнікумах фізічнай культуры, Магілёўскім дашкольным пед. вучылішчы, на ф-тах фізічнага выхавання Гомельскага і Брэсцкага пед. ін-таў.

У наш час на Беларусі спецыялістаў з сярэдняй спец. адукацыяй з наданнем кваліфікацыі «трэнер па віду спорту» рыхтуюць вучылішчы алімпійскага рэзерву, а спецыялістаў з вышэйшай фізкультурнай адукацыяй — выкладчыкаў фізічнай культуры — ф-ты фізічнага выхавання пед. ун-таў і Бел. дзярж. ун-т фізічнай культуры. Акрамя таго, ва ун-це фізічнай культуры вядзецца падрыхтоўка трэнераў па відах спорту, спецыялістаў па дашкольным фізічным выхаванні, фізкультурна-аздараўленчай рабоце і турызме, лячэбнай фізічнай культуры, фізічнай рэабілітацыі, менеджэраў спорту і турызму. У складзе ун-та 4 ф-ты, Ін-т павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў фізічнай культуры і спорту, аспірантура і дактарантура.

Штогод у краіне рыхтуецца каля 350 спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай і больш за 750 — з вышэйшай адукацыяй, якія працуюць ва ўсіх сферах галіны — трэнерамі па відах спорту (дзіцяча-юнацкія спарт. школы, спарт. клубы, секцыі калектываў фізічнай культуры, зборныя каманды), выкладчыкамі фізкультуры (вышэйшыя і сярэднія спец. навуч. ўстановы, каледжы, прафес.-тэхн. вучылішчы), настаўнікамі фізкультуры сярэдніх школ, а таксама ў сферы арганізацыі і кіравання фізкультурным рухам (дырэктары спарт. школ, спарт. баз, дзярж. трэнеры, работнікі Мін-ва спорту і турызму, федэрацый) і інш. Курсы павышэння кваліфікацыі штогод праходзяць больш за 2800 спецыялістаў фізічнай культуры, спорту і турызму, ажыццяўляецца перападрыхтоўка каля 100 чалавек.

На Беларусі дзейнічае больш за 40 ВНУ і практычна ў кожнай з іх функцыянуе кафедра фізічнага выхавання. Падрыхтоўка спарт. рэзерву ажыццяўляецца ў спецыялізаваных вучэбна-спарт. установах. Сярод іх (на пач. 2004) 10 вучылішчаў алімпійскага рэзерву (2744 навучэнцы), 13 школ вышэйшага спарт. майстэрства (1535 навучэнцаў), 8 цэнтраў алімпійскай падрыхтоўкі (2280 чал.), 162 спецыялізаваныя дзіцяча-юнацкія школы алімпійскага рэзерву (53 474 навучэнцы), 281 дзіцяча-юнацкая спарт. школа (119 914 вучняў), 45 дзіцяча-юнацкіх клубаў фізічнай падрыхтоўкі (34 481 вучань).

На пач. 2004 на Беларусі працуюць 24 830 спецыялістаў па фізічнай культуры і спорце. Сярод іх з вышэйшай фізкультурнай адукацыяй — 18 088, з сярэдняй спец. — 3394. Урокі фізічнай культуры ў агульнаадукацыйных школах забяспечваюць 8169 настаўнікаў, вучэбна-трэніровачны працэс у спецыялізаваных вучэбна-спарт. установах — 5932 трэнеры-выкладчыкі па спорце, у дзіцячых дашкольных установах фізічнае выхаванне забяспечваюць 2224 спецыялісты, у калектывах фізічнай культуры па месцах жыхарства з насельніцтвам працуюць каля 2300 інструктараў-метадыстаў.

*Літ.*: Кулинкович К.А. Развитие физической культуры и спорта в БССР. Мн., 1969; Физическая культура и спорт БССР. Мн., 1979.

*В.І.Марозаў.*

**СПАРТСМЕНЫ БЕЛАРУСІ НА АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯХ**

Спартсмены Беларусі ўпершыню прынялі ўдзел у Алімпійскіх гульнях у 1952 (XV Алімпіяда, г. Хельсінкі) у складзе зборнай каманды СССР (4 лёг-

Репозиторий БГПУ

манды (камбінаваная эстафета 4×100 м). Сярэбранымі ўзнагародамі адзначаны: Л.Тараненка (цяжкая атлетыка), С.Смаль (вольная барацьба), І.Астапковіч (кіданне молата) і Н.Шыколенка (кіданне кап'я). Бронз. медалі заваявалі: В.Аруджаў (вольная барацьба), С.Дземяшкевіч (грэка-рымская барацьба), К.Хадатовіч і А.Хлопцава (акадэмічнае веславанне, чацвёрка парная), Н.Зверава (тэніс).

На XXVI Алімпійскіх гульнях (1996, г. Атланта, ЗША) Рэспубліка Беларусь упершыню была прадстаўлена самастойнай нац. камандай. У яе складзе былі 162 спартсмены: 34 лёгкаатлеты, 16 гімнастаў, 11 плыўцоў, 18 па акадэмічным веславанні, па 10 цяжкаатлетаў і стралкоў, па 8 у грэка-рымскай барацьбе і маст. гімнастыцы, па 7 барцоў вольнага стылю і веласіпедыстаў, 6 па парусным спорце, па 5 баксёраў і па скачках у ваду, 4 дзюдаісты, 3 па веславанні на байдарках і каноэ, па 2 у бадмінтоне, стральбе з лука, па 1 па тэнісе, настольным тэнісе, фехтаванні і водным слаламе. Залатыя медалі заваявала К.Хадатовіч (акадэмічнае веславанне, байдарка-адзіночка). Сярэбраныя медалі заваявалі: Н.Сазановіч (сямібор'е), А.Паўлаў і С.Ліштван (грэка-рымская барацьба), А.Мядзведзеў (вольная барацьба), І.Басінскі (стральба з адвольнага пісталета), У.Дуброўшчык (кіданне дыска). Бронз. ўзнагародамі адзначаны: гімнаст В.Шчэрба (4 бронз. медалі: асабістае мнагабор'е, апорны скачок, практыкаванні на брусах і перакладзіне), В.Цыленьць (грэка-рымская барацьба), В.Капцюх і Э.Зверава (кіданне дыска), Н.Волчак, Т.Давыдзенка, М.Знак, Н.Лаўрыненка, А.Мікуліч, А.Панькіна, Я.Паўловіч, В.Скрабатун і Н.Стасюк — (у акадэмічным веславанні, васьмёрка). У неафіцыйным камандным заліку каманда Беларусі заняла 18-е месца сярод 197 краін-удзельніц (200 заліковых ачкоў).

На XXVII Алімпійскіх гульнях (2000, г. Сідней, Аўстралія) у складзе каманды Беларусі 138 спартсменаў: 30 лёгкаатлетаў, па 12 гімнастаў і стралкоў, 10 па акадэмічным веславанні, 9 плыўцоў, 8 па маст. гімнастыцы, па 7 барцоў вольнага і грэка-рымскага стылю, па 5 — ў дзюдо, веславанні на байдарках і каноэ, настольным тэнісе, цяжкай атлетыцы, па 4 у парусным спорце, тэнісе і фехтаванні, па 2 у скачках у ваду, на батуце, сінхронным плаванні, сучасным пяцібор'і і стральбе з лука, 1 баксёр. Залатыя медалі заваявалі: К.Хадатовіч (Карстэн) у акадэмічным веславанні на байдарцы-адзіночцы, Я.Карольчык (штурханне ядра), Э.Зверава (кіданне дыска). Сярэбранымі медалямі адзначаны: Ю.Раскіна (маст. гімнастыка, асабісты залік), Т.Ананька, Т.Бялан, А.Глазкова, І.Ільянкова, М.Лазук, В.Пужэвіч (маст. гімнастыка, камандны залік), І.Басінскі (кулявая стральба. адвольны пісталет); ён жа атрымаў і бронз. медаль у стральбе з пнеўматычнага пісталета. Бронз. медалі заваявалі: стралкі С.Мартынаў (адвольная вінтоўка) і Л.Яўглеўская (пісталет), цяжкаатлеты Г.Аляшчук і С.Лаўрэнаў, дзюдаіст А.Ларукоў, у грэка-рымскай барацьбе Дз. Дзябелка, лёгкаатлеты І.Астапковіч (кіданне молата), І.Ятчанка (кіданне дыска), Н.Сазановіч (сямібор'е), у сучасным пяцібор'і П.Доўгаль. У неафіцыйным камандным заліку каманда Беларусі заняла 16-е месца сярод 199 краін-удзельніц (225 заліковых ачкоў).

На XXVIII Алімпійскіх гульнях (2004, Афіны) у камандзе Беларусі 147 спартсменаў па 23 відах спорту: 39 лёгкаатлетаў, 11 па акадэмічным веславанні, па 9 у вольнай барацьбе, плаванні і кулявой стральбе, па 8 у маст. гімнастыцы і цяжкай атлетыцы, 7 па дзюдо, па 6 у боксе, веласпорце, веславанні на байдарках і каноэ, 5 у настольным тэнісе, 4 у грэка-рымскай барацьбе, па 3 у спарт. гімнастыцы, скачках у ваду, скачках на батуце, сучасным пяцібор'і, па 2 у сінхронным плаванні, стральбе з лука, тэнісе і фехтаванні, па 1 у конным і парусным спорце. Каманда Беларусі заваявала 15 медалёў: 2 залатыя, 6 сярэбраных і 7 бронзавых. Залатымі прызёрамі сталі Ю.Несцярэнка (бег на 100 м) і І.Макараў (дзюдо). Сярэбраныя медалі заваявалі К.Карстэн (акадэмічнае веславанне, байдарка-адзіночка), Г.Бацюшка і А.Рыбакоў (цяжкая атлетыка), В.Зуеў і М.Арыпгаджыеў (бокс), І.Ціхан (кіданне молата). Бронз. узнагарод удастоены В.Макаранка (грэка-рымская барацьба), Н.Цылінская (веласпорт, трэк), Ю.Бічык і Н.Гелах (акадэмічнае веславанне, двойка расхінная), І.Ятчанка (кіданне дыска), С.Мартынаў (стральба кулявая), Т.Стукалава (цяжкая атлетыка), Р.Петрушэнка і В.Махнеў (веславанне на байдарках і каноэ, байдарка-двойка). У неафіцыйным камандным заліку Беларусь заняла 26-е месца сярод 202 краін-удзельніц, а па колькасці медалёў — 18-е месца.

У зімовых Алімпійскіх гульнях бел. спартсмены ўдзельнічаюць з 1964. На IX зімовых Алімпійскіх гульнях (г. Інсбрук, Аўстрыя) у складзе зборнай каманды СССР выступаў канькабежац Э.Матусевіч (заняў 6-е месца на дыстанцыі 1500 м). Ён жа быў адзіным прадстаўніком Беларусі і на X зімовых Алімпійскіх гульнях (1968, г. Грэнобль, Францыя), дзе заняў 8-е месца. На XIV зімовых Алімпійскіх гульнях (1984, г. Сараева, Югаславія) бел. спартсменка Т.Маркашанская заняла 13-е месца ў лыжнай гонцы на 20 км. Першым з бел. спарсменаў, які атрымаў бронз. медаль на XV зімовых Алімпійскіх гульнях (1988, г. Калгары, Канада), быў канькабежац І.Жалязоўскі на дыстанцыі 1000 м, 4-м у бегу на 1500 і 6-м на дыстанцыі 500 м.

На XVI зімовых Алімпійскіх гульнях (1992, Альбервіль, Францыя) з Беларусі выступалі 3 біятланісты і 1 канькабежац у складзе зорнай каманды СНД. Залаты медаль заваяваў бел. біятланіст Я.Рэдзькін у гонцы на 20 км. Сярэбраны медаль у эстафетнай гонцы заваяваў А.Папоў; ён быў 4-м у гонцы на 20 км. Канькабежац І.Жалязоўскі заняў 6-е месца на дыстанцыі 1000 м і 8-е ў бегу на 500 м.

На XVII зімовых Алімпійскіх гульнях (1994, г. Лілехамер, Нарвегія) Беларусь упершыню выступала асобнай нац. камандай. У яе складзе былі 32 спартсмены: 10 біятланістаў, 9 лыжнікаў, 5 фігурыстаў, 4 фрыстайлісты, 2 канькабежцы і па 1 у лыжным дваябор'і і скачках на лыжах з трампліна. Сярэбраныя ўзнагароды заваявалі С.Парамыгіна (біятлон, гонка на 76,5 км; яна ж была 4-й у гонцы на 15 км), І.Жалязоўскі (скарасны бег на каньках на дыстанцыі 1000 м). У неафіцыйным заліку зборная каманда Беларусі заняла 16-е месца (37 ачкоў).

На XVIII зімовых Алімпійскіх гульнях (1998, г. Нагана, Японія) каманда Рэспублікі Беларусь складалася з 57 спартсменаў: 22 хакеісты, 10 лыжнікаў, 9 біятланістаў, 6 фрыстайлістаў, 4 канькабежцы і па 2 спартсмены ў фігурным катанні, лыжным дваябор'і і скачках на лыжах з трампліна. Бронз. медалі заваявалі: А.Айдараў (біятлон), гонка на 20 км) і Дз.Дашчынскі (фрыстайл, акрабатычныя скачкі). У неафіцыйным заліку зборная каманда Беларусі заняла 20-е месца (20,5 ачка).

На XIX зімовых Алімпійскіх гульнях (2002, г. Солт-Лейк-Сіці, ЗША) каманда Беларусі складалася з 62 спартсменаў: 23 хакеісты, 14 лыжнікаў, 10 біятланістаў, 5 фрыстайлістаў, 2 фігурысты і па 1 у шорт-трэку, лыжным дваябор'і і скачках на лыжах з трампліна. Бронз. медаль заваяваў фрыстайліст А.Грышын (у акрабатычных скачках). Хакейная зборная каманда Беларусі заняла 4-е месца. У неафіцыйным заліку каманда Беларусі заняла 19-е месца (30 ачкоў).

*А.А.Сярэдзін.*

Рэпазіторый БГПУ

**Беларуская** энцыклапедыя: У 18 т. Т. 18. Кн. 2: Рэспубліка
Б 43 Беларусь / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. — Мн.: БелЭн, 2004. — 760 с.: іл.

**ISBN 985-11-0295-4 (т. 18. Кн. 2)**
**ISBN 985-11-0310-1**

**УДК 03(476)**
**ББК 92(4Беи)**

Репозиторий БГПУ

**Заўважаныя недакладнасці і памылкі друку ў 18 томе кн. 1 БелЭн**

| Старонка | Слупок | Радок | Надрукавана | Трэба чытаць |
|---|---|---|---|---|
| 368 | сярэдні | 2 знізу | **ГАНЧАРО́НАК** Ігар Мікалаевіч | **ГАНЧАРО́НАК** Ігар Іванавіч |